УДК 316.722(=512.145) : [316.4.063.3:008(476)]

# СПЕЦЫФІКА КУЛЬТУРНАЙ ІНТЭГРАЦЫІ МУСУЛЬМАН У БЕЛАРУСІ

**М. А. Татарэвіч,**
*аспірант кафедры культуралогіі БДУКМ*

Паступіў у рэдакцыю 09.10.20.

UDC 316.722(=512.145) : [316.4.063.3:008(476)]

# SPECIFICITY OF CULTURAL INTEGRATION OF MUSLIMS IN BELARUS

**M. Tatarevich,**
*Postgraduate Student of the Department of Cultural Studies, BSUCA*

Received on 09.10.20.

Рэспубліка Беларусь – полікультурная дзяржава, і мусульманская супольнасць з'яўляецца яе неад'емнай часткай. За апошнія дзесяць гадоў колькасць носьбітаў ісламскай культурнай традыцыі на тэрыторыі Беларусі толькі павялічылася. У сувязі з гэтым праблема ўваходжання мусульман у беларускае сацыякультурнае асяроддзе застаецца актуальнай. Мэта даследавання – выявіць спецыфіку культурнай інтэграцыі мусульман у сучаснае беларускае грамадства. Яе дасягненне ажыццяўлялася праз правядзенне эмпірычнага даследавання з выкарыстаннем метадаў анкетнага апытання і глыбіннага інтэрв'ю мусульман. На аснове атрыманых даных у артыкуле прапанаваны рэкамендацыі па інтэнсіфікацыі інтэграцыйных працэсаў сярод сучасных мусульман Беларусі. Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны як навукоўцамі, так і ўсімі зацікаўленымі спецыялістамі для найлепшага разумення рэальнага стану і тэндэнцый развіцця інтэграцыйных працэсаў сярод мусульман у Беларусі.

*Ключевые слова:* мусульмане, культурная інтэграцыя, Беларусь.

The Republic of Belarus is a polycultural state and Muslim community is its inalienable part. During the latest ten years the number of Islamic cultural tradition carriers in the territory of Belarus has increased. In connection with this the problem of introduction of Muslims into Belarusian socio-cultural environment remains relevant. The objective of the research is revealing the specificity of cultural integration of Muslims into modern Belarusian society. Its achieving has been realized through conducting an empirical research with the help of methods of surveys and deep interviewing of Muslims. On the base of the obtained data the article suggests recommendations on intensification of integration processes among modern Muslims of Belarus. The results of the research can be used by scientists and all the interested specialists for better understanding of real state and tendencies of development of integration processes among Muslims of Belarus.

*Keywords:* Muslims, cultural integration, Belarus.

*Уводзіны.* У сучаснай культуралогіі павышаную цікавасць выклікае праблема станаўлення мусульманскай духоўнай традыцыі ў розных рэгіёнах свету. На тэрыторыі Беларусі стагоддзямі прысутнічала ісламская культура, якую шэраг даследчыкаў называе «літоўска-татарскай» [1; 2]. Культурная інтэграцыя мусульман у Беларусі мае свае асаблівасці, якія адрозніваюць яе ад інтэграцыі мусульман у заходнееўрапейскіх дзяржавах.

Інтэграцыйныя працэсы мусульман у Беларусі пачаліся яшчэ ў XIV ст. і значным чынам паўплывалі на станаўленне беларускай культуры. Іх супольнасць сёння з'яўляецца неад'емнай часткай беларускага грамадства. Згодна з апошнім перапісам (2019 г.), іслам на тэрыторыі Беларусі вызнаюць каля 27 народаў (татары, азербайджанцы, туркмены, узбекі, казахі, таджыкі, башкіры, туркі, афганцы, чачэнцы, аварцы, абхазы, кыргызы, даргінцы, караімы і інш.) [3]. Калі параўнаць колькасць прадстаўнікоў мусульманскай культурнай традыцыі з папярэднімі перапісамі (1999, 2009 гг.), то можна адзначыць павелічэнне колькасці татараў, арабаў, таджыкаў і туркмен. Улічваючы гэты факт, праблема вывучэння асаблівасцей культурнай інтэграцыі мусульман застаецца актуальнай і патрабуе больш глыбокага навуковага асэнсавання.

Мэта даследавання – выяўленне спецыфікі культурнай інтэграцыі мусульман у сучаснае беларускае грамадства.

*Асноўная частка.* Дасягненне пастаўленай аўтарам у дадзеным артыкуле мэты ажыццяўлялася праз правядзенне эмпірычнага даследавання з выкарыстаннем метадаў анкетнага апытання і глыбіннага інтэрв'ю. Для гэтага была распрацавана анкета, якая змяшчае 27 пытанняў аб рэлігійнай прыналежнасці, валоданні мовай, узроўні адукацыі і інфармацыйнага забеспячэння і г. д. Апытанне праводзілася ў канцы 2019 – пачатку 2020 г. сярод прадстаўнікоў мусульманскай супольнасці Рэспублікі Беларусь ва ўзросце ад 18 гадоў і старэй.

Усяго былі апытаны 262 чалавекі; з іх 66,8 % (175) – рэспандэнтаў мужчынскага полу, 33,2 % (87) – жаночага. Па ўзроставых катэгорыях рэспандэнты размеркаваліся наступным чынам: да 20 гадоў – 2,8 %, 20–29 гадоў – 16 %, 30–39 гадоў – 26,3 %, 40–49 гадоў – 33,7 %, 50–59 гадоў – 10,7 %, 60–69 – 7,6 %, 70–79 – 2,3 %. Такім чынам, большую частку рэспандэнтаў складаюць мужчыны і жанчыны ва ўзросце ад 40 да 49 гадоў.

Першы кірунак аналізу і інтэрпрэтацыі даных даследавання звязаны з выяўленнем ступені рэлігійнасці носьбітаў мусульманскай культурнай традыцыі. Ад характару рэлігійнасці залежыць ступень гатоўнасці да змены ацэнкі сацыяльнай рэальнасці і запазычванню мадэлей паводзінаў, уласцівых беларускай сацыякультурнай прасторы. Зыходзячы з вынікаў апытання, толькі нязначная частка рэгулярна і ў поўнай меры выконвае прадугледжаныя ісламам прадпісанні: шахада (пасведчанне аб веры ў адзінага Бога (Алаха) і місіі прарока Мухамеда) – 66,7 %, намаз (абавязковая штодзённая пяцікратная малітва) – 73 %, закят (абавязковы штогадовы падатак на карысць маючых патрэбу адзінаверцаў) – 22,1 %, ураза (строгі пост у месяц Рамадан) – 30,9 %, хадж (паломніцтва, звязанае з наведваннем Мекі) – 19,4 %. Астатнія 7,2 % апытаных не далі адназначнага адказу на гэта пытанне. Па выніках апытання па дадзеным блоку пытанняў можна зрабіць выснову, што ступень рэлігійнасці прадстаўнікоў мусульманскай традыцыі таксама залежнасць ад краіны паходжання асобы: у агульным выпадку мусульмане з краін былога Савецкага Саюза найменш рэлігійныя.

Даследаванне паказала залежнасць паспяховасці інтэграцыі ад узроўню адукацыі мусульман. Гэта значыць, чым вышэй узровень адукацыі мусульман, тым лягчэй і хутчэй яны асвойваюцца ў новай культуры. Па выніках анкетавання 66,5% працэнтаў апытаных мусульман маюць вышэйшую адукацыю, з іх 71 % атрымалі яе ў беларускіх ВНУ. Працэс навучання ў беларускіх ВНУ прадугледжвае больш актыўныя сацыяльныя кантакты мусульман з беларусамі. Больш таго, у ходзе працяглага навучання паміж аднагрупнікамі могуць узнікаць больш цесныя міжасобасныя адносіны, што таксама спрыяе больш глыбокаму ўключэнню мусульман у беларускую культуру. На наш погляд, атрыманне мусульманамі вышэйшай адукацыі на тэрыторыі Беларусі станоўчым чынам уплывае на працэс ітэграцыі ў беларускае грамадства.

Немалаважны паказчык культурнай інтэграцыі мусульман – валодонне мовай краіны прыёму, з'яўляецца агульным для ўсіх мусульман прэдыктарам паспяховай культурнай інтэграцыі. Моўная інтэграцыя разглядаецца ў русле стратэгіі працэсу ўзбагачэння, засваення мовы. У якасці тэарэтыка-метадалагічных падстаў мы выяўляем, што культурная інтэграцыя мусульман у дамінуючую культуру ёсць працэс актыўнага ўзбагачэння асобы сацыякультурным досведам беларускай культуры, звязана з моўнай асіміляцыяй і фарміраваннем другаснай моўнай асобы. Таму валоданне мовай прымаючай краіны з'яўляецца важным паказчыкам інтэграцыі. Другасная моўная асоба (прадстаўнік іншаэтнічнага насельніцтва), спасцігаючы мову і інакультуру, тым самым пашырае сваю моўную свядомасць.

Веданне мовы прымаючай культуры ўплывае на колькасць і якасць міжкультурных кантактаў, забяспечвае магчымасць інтэнсіўнага ўзаемадзеяння з прадстаўнікамі мясцовай культуры, значна аблягчае ўваходжанне мусульман у новы культурны асяродак.

Атрыманыя даныя сведчаць аб тым, што большая частка мусульман добра валодаюць рускай мовай, многія добра засвоілі і беларускую (табліца 1).

***Табліца 1* – Ацэнка рэспандэнтамі ступені валодання мовай**

| Мова | Ступені валодання мовай | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Валодаю свабодна | Валодаю ў ступені, дастатковай для зносін | Валодаю, але адчуваю цяжкасці пры зносінах | Разумею з цяжкасцю | Не валодаю |
| Беларуская мова | 16,4 % | 22,1 % | 33,9 % | 18,3 % | 9,5 % |
| Руская мова | 85,8 % | 10,6 % | 3,4 % | 0 % | 0 % |
| Арабская мова | 8,7 % | 4,1 % | 14,5 % | 24 % | 48,8 % |

Так, асаблівасцю мусульманскай супольнасці ў сучаснай Беларусі ў параўнанні з краінамі Заходняй Еўропы з'яўляецца тое, што большасць з іх складаюць выхадцы з краін былога Савецкага Саюза. З прычыны гэтага для многіх першапачаткова няма моўнага бар'еру. Гэта з'яўляецца фактарам, які істотна аблягчае інтэграцыю ў беларускім грамадстве ўжо на пачатковым яе этапе. Варта, аднак, улічваць, што адукацыйная палітыка постсавецкіх рэспублік прывяла да таго, што маладое пакаленне жыхароў сярэднеазіяцкіх дзяржаў беларускай мовай часта ўжо не валодае, але добра валодае рускай, якая зараз

з'яўляецца другой дзяржаўнай мовай Рэспублікі Беларусь.

Такім чынам, валоданне мовай дамінуючага грамадства становіцца імпульсам для трансфармацыі ідэнтычнасці другаснай моўнай асобы, паколькі мова з'яўляецца адным з інструментаў сацыялізацыі людзей у грамадстве і культуры, а таксама інструментам устанаўлення і падтрымання сацыяльных адносін. Менавіта веданне рускай і беларускай мовы дае магчымасць атрымання інфармацыі аб правілах і нормах паводзін у грамадстве, традыцыях, мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь, зніжае залежнасць ад землякоў і мусульманскіх суполак. Валоданне рускай і беларускай мовай пашырае магчымасці кантактаў з мясцовым насельніцтвам, забяспечвае рэалізацыю сацыяльных, культурных, эканамічных і іншых праў мусульман.

На паспяховасць працэсу культурнай інтэграцыі мусульман уплывае таксама ступень талерантнасці прымаючага (беларускага) грамадства да іншых сістэм каштоўнасцей, культурных асаблівасцей, а таксама ступень устойлівасці-гнуткасці індывідуальнай сістэмы каштоўнасцей і ўстановак. Мяркуецца існаванне шэрагу індывідуальных каштоўнасцей, якія аказваюць станоўчы ўплыў на тэрміны і паспяховасць інтэграцыі.

Зыходзячы з вынікаў анкетавання, уяўляецца магчымым вылучыць наступныя каштоўнасці беларускага грамадства, якія спрыяюць міжкультурнаму ўзаемаразуменню, адзначаныя мусульманамі: талерантнасць – 35,1 %, верацярпімасць – 27,8 %, дружалюбнасць – 20,2 %, дабрыня – 16,4 %, гасціннасць – 13,7 %, спагадлівасць – 13,7 %, павага – 8,3 %, працавітасць – 4,1 %, шчырасць – 4,1 %, паразуменне – 2,6 %, адкрытасць – 2,6 %, міралюбнасць – 1,9 %, мяккасць – 1,8 %, добрасумленнасць – 0,7 %, душэўнасць – 0,7 %, спачуванне – 0,7 %, камунікабельнасць – 0,3 %, справядлівасць – 0,3 %, сумленнасць – 0,7 %, ветлівасць – 0,3 %, шчодрасць – 0,3 % (Заўвага – сума працэнтаў больш за 100 %, так як рэспандэнты маглі даць больш аднаго варыянта адказу).

Таксама вельма важным для інтэграцыі мусульман з'яўляецца ступень знаёмства з беларускімі культурнымі асаблівасцямі. Прагназаванне культурнай інтэграцыі магчыма, зыходзячы з узроўню інфармаванасці пра спецыфіку той ці іншай культуры. Відавочны ўплыў ведаў пра краіну, яе звычаяў, традыцый, нормаў і каштоўнасцей на носьбітаў ісламскай традыцыі. Па адказам рэспандэнтаў бачна, что мусульмане наогул задаволены колькасцю інфармацыі пра беларускую культуру, аднак перавага надаецца інтэрнэт-крыніцам (табліца 2).

З вынікаў даследвання бачна, што носьбіты ісламскай культурнай традыцыі не толькі добра інфармаваны аб беларускай культуры, але засвайваюць і выконваюць каштоўнасці, нормы, стандарты паводзін беларускай супольнасці (рысунак).

Станоўча ўплывае на інтэграцыю той факт, что мусульмане актыўна адзначаюць дзяржаўныя і традыцыйныя святы Рэспублікі Беларусь. Самымі папулярнымі святамі, па адказах мусульман, з'яўляюцца: Новы год, Дзень Незалежнасці, Дзень Пабеды, Дзень горада, 8 сакавіка, 1 мая, Дзень абаронцаў айчыны, Купалле і інш. Удзел мусульман і мясцовых жыхароў у сумесных формах актыўнасці і грамадскага жыцця, уключаючы культурныя і інтэграцыйныя мерапрыемствы, спрыяюць падтрымцы талерантнасці і салідарнасці паміж мусульманамі і карэнным насельніцтвам Беларусі, нецярпімасці да нацыяналістычнага і фундаменталісцкага экстрэмізму.

Узаемаадносіны з прымаючым грамадствам уплываюць на інтэграцыю мусульман – яны пачынаюць паступова атаясамліваць сябе з мясцовым насельніцтвам, пераймаць яго звычкі і ва ўсё большай меры адчуваць сябе мясцовымі жыхарамі. У выпадку ж апоры выключна на сяброў, сваякоў і суайчыннікаў з краіны паходжання, на сацыяльныя сувязі і зносіны выключна з аднаверцамі мусульмане аказваюцца ўцягнуты ў міграцыйныя сеткі, што можа весці да адасаблення ад мясцовага насельніцтва, непрыманню яго традыцый і нормаў, фарміраванню этнічных анклаваў. Мусульмане ў цэлым станоўча ацэньваюць адносіны да сябя мясцовага насельніцтва і зацікаўлены ў камунікацыі з імі. Аб гэтым сведчыць размеркаванне адказаў мусульман на пытанне: «Як бы Вы ў цэлым ацанілі стаўленне мясцовага насельніцтва да сябе?»: прыязнае – 47,5 %; хутчэй станоўчае, чым адмоўнае – 45,4 %; хутчэй адмоўнае, чым станоўчае – 5,7 %; хутчэй негатыўнае – 0,7 %; рэзка негатыўнае – 0,7 %.

***Табліца 2* – Задаволенасць рэспандэнтамі ўзроўнем размешчанай інфармацыі пра культуру Беларусі ў СМІ і інтэрнэт-крыніцах**

| Варыянты адказаў | Традыцыйныя СМІ | Інтэрнэт-крыніцы |
|---|---|---|
| Так | 19 % | 47,7 % |
| Хутчэй так | 50 % | 41,6 % |
| Хутчэй не | 19 % | 5,3 % |

| | | |
|---|---|---|
| Не | 4,1 % | 1,5 % |
| Мне цяжка адказать | 7,6 % | 3,8 % |




*Рысунак – Размеркаванне адказаў мусульман на пытанне: «Наколькі істотна для Вас веданне і выкананне каштоўнасцей і нормаў жыцця беларускага грамадства?»*

Даныя даследавання дазваляюць вылучыць наступныя асноўныя тыпы інтэграцыйнага працэсу мусульман у беларускае грамадства: 1) актыўны тып, які характарызуецца перавагай актыўнага ўздзеяння на сацыяльную і культурную сераду; 2) пасіўны тып, вызначаецца пасіўным, канформным прыняццем мэтаў і каштоўнасных арыентацый іншай культурнай групы. Па выніках анкетавання відаць, што большая частка мусульман (73,4 %) зацікаўлена ў праектах міжкультурнага напрамку і адзначылі формы мерапрыемстваў, якія б хацелі наведваць: дні нацыянальных культур (21,7 %), канцэрты (15,2 %), фестывалі (10,7 %), выставы (8,1 %), кірмашы (6,6 %), семінары (4,9 %), канферэнцыі (1,5 %), прэзентацыі (0,3 %) і розныя (11,8 %).

Як паказваюць атрыманыя намі вынікі, мусульмане з'яўляюцца актыўнымі членамі сваіх абшчын і рэлігійных, грамадска-культурных аб'яднанняў, паколькі 71,4 % уваходзяць у іх склад. Інтэрв'ю з прдстаўнікамі мусульманскіх абшчын і аб'яднанняў паказвае, што іх суполкі з'яўляюцца ключавым механізмам у інтэграцыйных працэсах. Яны спрыяюць задавальненню інтарэсаў і запытаў кожнага мусульманіна і яго нацыянальнай групы, сцвярджэнню ў міжнацыянальных зносінах узаемнай павагі, устанаўленню і падтрыманню культурных сувязей з дзяржаўнымі ўтварэннямі ў Рэспубліцы Беларусь і роднаснымі нацыянальнымі групамі за мяжой. Такім чынам, вынікі даследавання паказваюць, што асноўнай мэтай мусульманскіх аб'яднанняў з'яўляецца не толькі дапамога ў працэсе інтэграцыі, але і ў выпрацоўцы механізмаў, якія дазваляюць ім не растварыцца ў навакольнай супольнасці прымаючай краіны.

Важны паказчык даследавання – дабраахвотнае прыняцце носьбітамі ісламскай культурнай традыцыі стратэгіі інтэграцыі. Так, 70,2 % мусульман пры анкетаванні адзначылі менавіта інтэграцыю як больш прыемны напрамак палітыкі Рэспублікі Беларусь у адносінах да этнічных меншасцей. Гэта сведчыць аб тым, што і самі мусульмане больш накіраваны на плаўны працэс уваходжання ў беларускую культуру. Адначасова гэта азначае, што выпрацаваная культурная палітыка Рэспублікі Беларусь спрыяе ўстанаўленню пераважна прыязных межэтнічных адносін у краіне.

Інтэграцыю мусульман неабходна разглядаць як працяглы сацыякультурны працэс. Дасягненне плаўнага ўваходжання мусульман ў беларускае асяроддзе прадугледжвае рэалізацыію пэўнага комплексу мер з боку дзяржаўных органаў улады, а таксама розных сацыякультурных інстытутаў краіны. Рэалізацыя накіраваных на дасягненне дадзенай мэты мерапрыемстваў павінна ажыццяўляцца з улікам таго, што яны, у сваю чаргу, таксама аказваюць значны ўплыў на сацыяльна-псіхалагічныя ўстаноўкі носьбітаў ісламскай культурнай традыцыі, іх стаўленне да мясцовага насельніцтва, разуменне сваёй уласнай ролі ў міжкультурным узаемадзеянні з імі.

Такім чынам, неабходна садзейнічаць культурнай інтэграцыі праз развіццё фарматаў уза-

емадзеяння мусульман і беларускага насельніцтва на мясцовым узроўні, павышэнне інфармаванасці жыхароў пра ролю мусульман у жыцці рэгіёна і спецыфіку іх становішча. Патрабуецца інфармаваць мусульман аб магчымасцях удзелу ў сацыякультурных мерапрыемствах як міжкультурнага кірунку, так і традыцыйна беларускіх. Інфармацыйная дзейнасць, з аднаго боку, з'яўляецца найважнейшым фактарам прафілактыкі ўзнікнення праблем узаемадзення мусульман з прымаючым грамадствам, з другога – сродкам стварэння неабходных ўмоў для іх эфектыўнага вырашэння ў выпадку ўзнікнення. Важна, каб мусульмане мелі базавае прадстаўленне не толькі аб беларускім заканадаўстве, механізмах яго выканання, але і аб нормах і правілах паводзін ў грамадстве, асаблівасцях культуры, масавых мерапрыемах міжкультурнага напрамку, магчымасцях культурнай інтэграцыі, атрымання сацыяльнай і іншай падтрымкі ад дзяржаўных і грамадскіх арганізацый. Валоданне такой інфармацыяй спрыяе працэсам культурнай інтэграцыі і прафілактыцы канфліктных сітуацый.

*Заключэнне.* Мусульмане прыўносяць у жыццё беларускага грамадства культурную разнастайнасць, сфарміраваныя ў іншых умовах каштоўнасці, нормы, звычаі і традыцыі. Яны не толькі спрыяюць развіццю навукі, культуры, эканомікі, але і пашыраюць тым самым магчымасці грамадства, надаюць імпульс абнаўлення традыцыйнай сістэме сацыяльна-культурных сувязей грамадства-рэцыпіента (беларускага грамадства), дапамагаючы яму вырашаць розныя праблемы. У выніку праведзенага даследавання можна адзначыць, што спецыфіка інтэграцыі мусульман у Беларусі выражаецца ў іх арыентацыі на ўзаемадзенне з мясцовым насельніцтвам, накіраванасці на засваенне традыцый, каштоўнасцей, норм, стандартаў паводзін прымаючай супольнасці, удзел у розных культурных мерапрыемствах краіны. У цэлым мусульмане задаволены ажыццяўляемай межкультурнай палітыкай Рэспублікі Беларусь, адносінамі да іх прадстаўнікоў мясцовага насельнітцва, а таксама сваім становішчам у грамадстве ўвогуле. Такім чынам, неабходна падтрымліваць дадзены курс усталявання межкультурных адносін у краіне і спрыяць інтэнсіфікацыі інтэграцыйных працэсаў праз забеспячэнне паўнавартаснага ўдзелу мусульман ў сацыякультурным жыцці беларускага грамадства. Для дасягнення гэтай мэты неабходна узмацняць інфармацыйны і камунікатыўны аспекты ўзаемадзеяння з мусульманамі, а таксама актывізаваць арганізацыю сумесных культурных мерапрыемстваў.

*Літаратура*

1. *Думін, С. У.* Беларускія татары: мінулае і сучаснасць / С. У. Думін, І. Б. Канапцкі. – Мінск : Полымя, 1993. – 206 с.
2. *Канапацкі, І. Б.* Гісторыя і культура беларускіх татар : вучэб. дапам. / І. Б. Канапацкі, А. І. Смолік. – Мінск : Бел. ун-т культуры, 2000. – 259 с.
3. Итоги переписи населения Республики Беларусь 2019 год // Перепись населения 2019 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.belstat.gov.by/informatsiya-dlya-respondenta/perepis-naseleniya/perepis-naseleniya-raunda-2020-goda/. – Дата доступа: 19.08.2020.

*References*

1. *Dumin, S. U.* Belaruskiya tatary: minulae i suchasnasc' / S. U. Dumin, I. B. Kanapcki. – Minsk : Polymya, 1993. – 206 s.
2. *Kanapacki, I. B.* Gistoryya i kul'tura belaruskih tatar : vucheb. dapam. / I. B. Kanapacki, A. I. Smolik. – Minsk : Bel. un-t kul'tury, 2000. – 259 s.
3. Itogi perepisi naseleniya Respubliki Belarus' 2019 god // Perepis' naseleniya 2019 [Elektronnyj resurs]. – Rezhim dostupa: https://www.belstat.gov.by/informatsiya-dlya-respondenta/perepis-naseleniya/perepis-naseleniya-raunda-2020-goda/. – Data dostupa: 19.08.2020.